**ПАМЯТАЕМ ПРА АДЗІНСТВА НАРОДА**
Пра мерапрыемствы ў БДУ, прысвечаныя святу
Стар. 2

**«Я ПЕРАПОЎНЕНА ЎРАЖАННЯМІ»: СТУДЭНТКА ФСК ПРА НАВУЧАННЕ ПА АБМЕНЕ**
Водгук студэнткі БДУ пра вучобу ў Калінінградзе
Стар. 3

**МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ЎНІВЕРСІТЭТА НА 2024/2025 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД**
І вынікі за мінулы
Стар. 4-5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

30 верасня 2024 года, № 9 (2287)

## АПТЫМІЗАЦЫЯ ПРЫЁМУ, ПЕРАГЛЯД СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯЎ, ПРАЦА З ЗАМОЎЦАМІ. БДУ ПАДВЁЎ ВЫНІКІ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце прайшоў савет, дзе быў прадстаўлены аналіз асноўных вынікаў працы ўстановы за 2023/24 навучальны год. Даклад уключаў у сябе ацэнку станоўчых тэндэнцый, выяўленых перспектыўных вектараў развіцця, а таксама цяжкасцяў і недапрацовак, якія патрабуюць карэкціроўкі. Карэспандэнт БелТА даведалася ў рэктара БДУ Андрэя Караля, па якіх ключавых напрамках дзейнасці ВНУназіраецца станоўчая дынаміка, а што будзе дапрацавана.**



«Ролю і аўтарытэт БДУ на дзяржаўным і міжнародным узроўнях адлюстроўваюць маштабныя падзеі ВНУ. Візіт дэлегацыі Пекінскага ўніверсітэта (ПКУ), азербайджанскай парламенцкай дэлегацыі, беларуска-кітайскі форум рэктараў, заснаванне Дзён сяброўства і адзінства БДУ і ПКУ, сеанс сувязі студэнтаў з першай беларускай жанчынай-касманаўтам Марынай Васілеўскай паказваюць на цэнтральнае значэнне БДУ ў адукацыі і навуцы краіны. Дадзены вектар падтрымліваецца і высокімі паказчыкамі ВНУ па ключавых напрамках», – адзначыў Андрэй Кароль.

Што да адукацыйнага працэсу, кіраўнік станоўча ацаніў правядзенне прыёмнай кампаніі, адкрыццё новых спецыяльнасцяў, укараненне сучасных адукацыйных падыходаў. «Тэндэнцыі сёлетняй кампаніі, абумоўленыя павелічэннем колькасці бюджэтных месцаў, катэгорый абітурыентаў, залічаных без іспытаў, зменай падыходаў да прыёму на завочную форму і па мэтавым навучанні адначасова запатрабавалі дадатковых намаганняў і агалілі некаторыя пытанні. Хуткім часам будзе праведзена аптымізацыя структуры прыёму, перагледжаны пералік спецыяльнасцяў на прадмет іх дублявання і ўнутранай канкурэнцыі, актывізавана праца з замоўцамі кадраў. Важна працягнуць адкрыццё запатрабаваных спецыяльнасцяў, пашырыць практыку атрымання студэнтам магчымасці вывучэння дадатковых дысцыплін на выбар, удасканаленне навучальна-праграмнай дакументацыі», – паінфармаваў рэктар.

Кажучы пра структурную рэарганізацыю навучальных падраздзяленняў, ён падкрэсліў, што развіццё міждысцыплінарнага вектара ў падрыхтоўцы спецыяліста патрабуе аб'яднання намаганняў розных кафедраў і інтэграцыі навук для распрацоўкі навучальных праграм і запуску новых спецыяльнасцяў. «За апошнія пяць гадоў у БДУ адкрыты 20 новых праграм бакалаўрыята і магістратуры, 93% якіх – міждысцыплінарныя. Для іх запуску ва ўніверсітэце зроблены шэраг крокаў. Шосты год працуе савет па міждысцыплінарных даследаваннях, трэці год – міждысцыплінарная метадалагічная школа, дзе выкарыстоўваецца патэнцыял розных навуковых школ і напрамкаў», – дадаў кіраўнік.

Навуковы складнік працы ўніверсітэта характарызуецца шэрагам пазіцый. Першая – экспарт навукаёмістай прадукцыі і паслуг, які ў 2023 годзе вырас амаль на 20% у параўнанні з 2022 годам і дасягнуў $2,76 млн. «Пры гэтым экспарт у Расію павялічыўся на 47%, а ў Кітай – на 56%. Значнымі для БДУ падзеямі стала дамоўленасць з Пекінскім універсітэтам пра стварэнне Кітайска-беларускага цэнтра фундаментальных навуковых даследаванняў, адкрыццё Кітайска-беларускай міжнароднай лабараторыі функцыянальных матэрыялаў у індустрыяльным парку "Вялікі камень". Акрамя таго, за апошнія гады ў нас захоўваецца станоўчая дынаміка абарон дысертацый навукоўцамі ВНУ, назіраецца стабільны рост ліку замежных аспірантаў, таксама больш чым у 1,5 раза павялічылася колькасць навучэнцаў на англійскай мове. Экспарт адукацыйных паслуг у 2023 годзе склаў Br2,5 млн, што на 47,1% больш у параўнанні з 2022 годам», – распавёў Андрэй Кароль.

У ВНУ ўзмоцнена прыцягненне моладзі да навуковых даследаванняў і выкладання, паколькі, па словах рэктара, менавіта з гэтага пачынаецца вырошчванне кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі.

«У новым навучальным годзе працягнецца праца па інтэграцыі навуковай, інавацыйнай і адукацыйнай дзейнасці, пашырэнні прысутнасці БДУ ў сусветнай навуковай прасторы, фарміраванні цэнтраў укаранення інавацый, павелічэнні долі прыкладных даследаванняў і распрацовак.

Кадравая палітыка ВНУ: у мінулым навучальным годзе былі праведзены арганізацыйныя і лакальныя нарматыўныя пераўтварэнні. Мы штогод карэкціруем функцыянал прарэктараў, арыентаваны на актуальныя напрамкі дзейнасці БДУ і запатрабаванні дзяржавы. Высокую эфектыўнасць паказала праца з кадравым рэзервам. Мы актывізавалі арганізацыю дадатковай адукацыі супрацоўнікаў з акцэнтам на ідэалагічную і выхаваўчую работу, лічбавую вышэйшую адукацыю і працу ў мультыкультурным і шматмоўным асяроддзі. Нададзена ўвага і амаладжэнню кадраў. Для замацавання маладых спецыялістаў на першым працоўным месцы ўкараняецца сістэма настаўніцтва, распрацоўваецца рэйтынгавая сістэма аплаты працы маладых навукоўцаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, прапрацоўваецца механізм арганізацыі мэтавай падрыхтоўкі студэнтаў для структурных падраздзяленняў ВНУ», – канстатаваў рэктар.

Добрыя перспектывы мае і выбудаваная сістэма праектнай, інфармацыйна-тлумачальнай і прафілактычнай дзейнасці ў выхаваўча-ідэалагічнай сферы. Павялічылася колькасць грамадскіх арганізацый БДУ. «Дарэчы, толькі

*Працяг на старонцы 2*



УНІВЕРСІТЭТ
30 верасня 2024 года, № 9 (2287)

*Працяг. Пачатак на стар. 1*

ў 1,5 раза павялічылася колькасць удзельнікаў студатрадаўскага руху. Тлумачальная праца з працоўным калектывам і навучэнцамі, асвета студэнцкай моладзі і работнікаў універсітэта па тэматыцы выбарчага працэсу ў Беларусі, павышэнне іх грамадзянскай актыўнасці і прававой культуры – усе гэтыя апрабаваныя падыходы паказалі сваю эфектыўнасць і будуць рэалізаваны падчас падрыхтоўкі да хуткіх выбараў Прэзідэнта краіны. Таксама ў гэтым навучальным годзе мы плануем рэалізаваць мерапрыемствы ў сферы моладзевай палітыкі ў рамках Саюзнай дзяржавы. У сувязі з гэтымі падзеямі актуальныя пытанні інфармацыйнай бяспекі, важнасці прафілактычных мер і выканання патрабаванняў лакальных прававых актаў, якія распрацаваны ў БДУ», – адзначыў Андрэй Кароль.

Эканамічныя паказчыкі ў мінулым навучальным годзе адзначаны планавым паступовым ростам заработнай платы прафесарска-выкладчыцкага складу. «Пры гэтым тэмп росту зарплаты ў тры разы перавышае тэмп росту інфляцыі. Рост у 1,5 раза даходаў, звязаных з павелічэннем экспартных паступленняў, нарошчваннем кантынгенту, распрацоўка і ўкараненне праграм англамоўнай магістратуры дазволілі ВНУ пераадолець уплыў антыкавідных абмежаванняў папярэдніх гадоў і захаваць дынаміку ўкладання сродкаў у матэрыяльна-тэхнічную базу ВНУ. Напрыклад, з апярэджаннем ідзе будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчага комплексу па вул. Курчатава, завяршаецца распрацоўка праектнай дакументацыі на ўзвядзенне лабараторнага корпуса біялагічнага факультэта», – паінфармаваў рэктар.

На Савеце БДУ былі не толькі прадстаўлены статыстычныя даныя па выніках мінулага навучальнага года, але і пастаўлены мэты і задачы на новы навучальны год, для дасягнення якіх прызначаны адказныя і вызначаны тэрміны.

**Святлана ПЕКАР, БелТА**

# ПАМЯТАЕМ ПРА АДЗІНСТВА НАРОДА

**Ужо чацвёрты год 17 верасня Беларусь адзначае Дзень народнага адзінства. Гэтае свята – знак памяці аб’яднання Заходняй Беларусі і БССР у 1939 годзе.**



Ва ўніверсітэце прайшло больш за 50 мерапрыемстваў, прысвечаных урачыстасці. Куратарская і інфармацыйная гадзіны, выставы, круглыя сталы. На факультэтах прайшла серыя дыялогавых пляцовак з удзелам дзяржаўных дзеячаў, прадстаўнікоў органаў улады, дэпутатаў і інш.

Адкрыла цыкл мерапрыемстваў дыялогавая пляцоўка «Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь як гарант фарміравання і развіцця прававой дзяржавы» з удзелам суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Руслана Царука.

Працягнуўся цыкл сустрэчай кіраўнікоў і прадстаўнікоў вядучых рэлігійных канфесій Беларусі са студэнтамі і супрацоўнікамі ўніверсітэта. Падчас мерапрыемства адбылася дыялогавая пляцоўка «Рэлігія і нацыянальная ідэнтычнасць», прымеркаваная не толькі да Дня народнага адзінства, але і да 90-годдзя з дня заснавання гістарычнага факультэта. Удзельнікамі сталі больш за 100 студэнтаў.

Міжканфесійны дыялог з моладдзю распачалі ўпаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак, першы прарэктар Інстытута тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірыла БДУ протаіерэй Сергій Маўсесян, кіраўнік Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі Іосіф Станеўскі, муфтый Мусульманскага рэлігійнага аб’яднання ў Беларусі Абу-Бекір Шабановіч і галоўны рабін рэлігійнага аб’яднання абшчын прагрэсіўнага іўдаізму ў Беларусі Рыгор Абрамовіч.

Аляксандр Румак адзначыў, што рэлігія назаўжды застанецца культурнай і неад’емнай часткай жыцця ўсяго беларускага грамадства. Разам з верай народ праходзіў важныя этапы свайго станаўлення, з ёю абараняў Радзіму і пранёс яе праз многія стагоддзі і самыя розныя перашкоды. Ён таксама нагадаў пра важнасць захавання верацярпімасці і талерантнасці для сучаснага пакалення.

Напярэдадні свята, 16 верасня, адбылася рэспубліканская дыктоўка «Дзень народнага адзінства». Яна праходзіла на ўсіх факультэтах і інстытутах у БДУ для выхавання ў моладзі пачуцця патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці і грамадзянскага абавязку.

Напісаць яе было прапанавана ўсім першакурснікам, аднак удзельнікам праекта мог стаць любы навучэнец, выкладчык і супрацоўнік БДУ. Чытала тэкст першы намеснік старшыні ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Алена Стэльмах.

Першакурснікі пазітыўна ўспрынялі акцыю.

– Напярэдадні такога вялікага свята, як Дзень народнага адзінства, вельмі важна нагадаць не толькі студэнтам першага курса, але і ўсім жыхарам нашай краіны, што Беларусь прайшла цяжкі шлях станаўлення ад першых плямёнаў да незалежнай дзяржавы. І гэта заслуга нашага народа, – падзялілася першакурсніца факультэта журналістыкі Ксенія Лявіцкая.

Студэнты лічаць, што напісанне рэспубліканскай дыктоўкі важнае для прыцягнення моладзі да захавання адзінства нашай краіны. Кожнаму трэба разбірацца ў гісторыі роднай краіны, станаўленні дзяржавы, у тым, як яна развіваецца зараз. А адзінства трэба берагчы, ахоўваць і абараняць.

– Як па мне, дыктоўка аб’ядноўвае не толькі беларускіх, але і замежных студэнтаў. Мне, як расіянцы, было таксама вельмі важна напісаць гэтую дыктоўку, бо нашы дзяржавы – саюзнікі, – сказала студэнтка журфака Васіліса Ларчык.

Свята 17 верасня стартавала з урачыстай лінейкай ва ўнутраным дворыку ВНУ з удзелам кіраўніцтва, студэнтаў, выкладчыкаў універсітэта. Пачалася лінейка з узняцця сцягоў пад гімн Рэспублікі Беларусь.

Па словах рэктара, гэты дзень – сімвал згуртаванасці нашага грамадства, паказальны прыклад прыхільнасці Радзіме і яе перакананням. Ён нагадаў пра выключную значнасць гістарычных падзей і іх уплыў на развіццё сучаснай Беларусі. Бо сёння ў свеце хуткасцяў і сацыяльных катаклізмаў мы ўсё часцей бачым падмену паняццяў, скажэнне важных гістарычных працэсаў. Цяпер вядзецца сапраўдная інфармацыйная барацьба за ключавыя падзеі мінулага. І калі мы хочам жыць у квітнеючай краіне, са сваімі ўласнымі каштоўнасцямі, поглядамі і ідэямі, то трэба не забываць такія значныя паняцці, як патрыятызм, нацыянальная ідэнтычнасць, гістарычная памяць.

– Толькі ў адзінстве непахіснасць краіны перад знешнімі выклікамі і пагрозамі, яе развіццё і росквіт, – дадаў Андрэй Кароль.

Запрошаным госцем мерапрыемства выступіў дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Сяргей Азаронак.

Ён адзначыў важнасць свята і нагадаў пра гістарычныя падзеі нашай краіны; расказаў пра асноўныя гістарычныя вехі развіцця БССР, польска-савецкую вайну 1919–1920 гадоў, пачатак вызваленчага паходу Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 годзе, подзвіг народа ў час Вялікай Айчыннай вайны, цяжкія гады аднаўлення і сучасныя дасягненні Беларусі.

Ад імя студэнтаў і гасцей свята звярнулася старшыня савета старастаў БДУ студэнтка другога курса факультэта міжнародных адносін Карына Юраства. Яна адзначыла пачуццё выключнага гонару за Радзіму.

– Мы ганарымся нашай гісторыяй, культурай, традыцыямі. Бо за намі – будучыня. І мы разам павінны пабудаваць яе для краіны. І настаўнікі, выкладчыкі і кіраўнікі павінны дапамагчы нам у гэтым, бо кожны павінен імкнуцца да таго, каб яго імя ведалі па ўсёй краіне, – падкрэсліла другакурсніца.

**Ганна КАЗАКОВА**





# «Я ПЕРАПОЎНЕНА ЎРАЖАННЯМІ»: СТУДЭНТКА ФСК ПРА НАВУЧАННЕ ПА АБМЕНЕ

**У другім семестры мінулага навучальнага года трэцякурсніца ФСК БДУ Анастасія Канавалава праходзіла навучанне ў Вышэйшай школе камунікацый і крэатыўных індустрый Балтыйскага федэральнага ўніверсітэта імя І. Канта (Калінінград, Расія). Спыталі ў дзяўчыны пра гэты вопыт.**

На вясенні семестр на стажыроўку ў БДУ прыехалі і чатыры студэнты БФУ імя І. Канта. Будучыя хімікі Ірына Лаўрэнцьева, Гор Тамазян і Лізавета Лісічкіна змаглі папрацаваць у сучасных лабараторыях БДУ і прыняць удзел у навуковых даследаваннях па сваім профілі. А студэнтка праграмы «Дызайн» Анастасія Хлебадарава асвоіла новыя тэхнікі ў галіне мастацтва і дызайну, займалася творчымі і даследчымі праектамі.






## КРЭАТЫЎ НА ПАРАХ

Навучанне Ганны ажыццяўлялася па праграме акадэмічнай мабільнасці на падставе дамовы аб супрацоўніцтве паміж БДУ і БФУ імя І. Канта. Падчас навучання студэнтка асвойвала такія прадметы, як «Малюнак», «Скульптура», «Праектаванне», «Асвятленне», «Сцэнарнае майстэрства», «Асновы рэжысуры», «Акцёрскае майстэрства», «Кампазітынг», «Скетчынг» і інш.

– У БФУ ёсць некалькі напрамкаў – «дызайн прасторавага асяроддзя», «графічны дызайн» і «дызайн мультымедыя і анімацыі». Экзамены здаюць агульныя, а пасля пры наяўнасці вольных месцаў студэнты выбіраюць спецыяльнасць, дзе хацелі б вучыцца. Адзіны мінус – набор на некаторыя з іх адбываецца не кожны год, – тлумачыць Насця. – Вучацца там чатыры гады, але і пры сціслай праграме «традыцыйнаму» малюнку надаецца вялікая ўвага. Напрыклад, такія прадметы, як «Жывапіс і каларыстыка», «Скетчынг» і «Акадэмічны малюнак» вывучаюць ажно да шостага семестра. На занятках па маляванні робяць ухіл на адмалёўкі фігур і галоў людзей, а на парах па жывапісе – на колеразнаўства.

Па словах студэнткі, асаблівымі для яе сталі тэарэтычныя заняткі, якія праходзілі ў фармаце выязных сустрэч. Адзін з яркіх успамінаў паездкі — пара па «Гісторыі мастацтваў», што праходзіла ў Музеі выяўленчых мастацтваў Калінінграда. Там для правядзення лекцый адводзілася асобная зона, а пасля студэнты пры жаданні маглі атрымаць бясплатныя пропускі ва ўсе выставачныя залы. Таксама адзначу, што спецыяльна для заняткаў па дысцыпліне «Асвятленне» ў корпусе абсталявалі часовую студыю, дзе студэнты самастойна вучыліся працаваць са святлом.

– Спадабалася, як крэатыўна на стажыроўцы маглі праходзіць пары. На «Акцёрскім майстэрстве» і «Асновах рэжысуры» мы ставілі сцэнкі, ігралі розных персанажаў, глядзелі фільмы і аналізавалі сцэнарыі. Лекцыйная частка добра спалучалася з практычнай, таму заняткі праходзілі актыўна і весела, – адзначыла трэцякурсніца. – Яшчэ ў БФУ развітая практыка запрашаць на заняткі практыкаў – дызайнераў з іншых гарадоў, супрацоўнікаў вядомых студый. Напрыклад, па анімацыі з намі працавала супервайзер студыі «Саюз». Акрамя гэтага, некаторыя выкладчыкі ладзілі гурткі, куды маглі прыходзіць студэнты любога курса. На адным з іх мне запомніліся цікавыя пазаўрочныя заняткі па фларыстыцы.

Дзяўчына вылучыла і пары па фізкультуры. Каб выканаць вучэбную нагрузку па гэтай дысцыпліне, студэнты Вышэйшай школы камунікацый і крэатыўных індустрый выбіралі секцыю па адным з відаў спорту: валейболе, тэнісе, баскетболе, гімнастыцы, цяжкай атлетыцы, плаванні ці пілатэсе. Сама Ганна спынілася на басейне. Радаваў студэнтку і расклад дня: пасля фізкультуры заўсёды ставілася «фортка», падчас якой можна было камфортна прывесці сябе ў парадак і, не спяшаючыся, даехаць да корпуса.

## АРГАНІЗАЦЫЯ ПОБЫТУ

Анастасія Канавалава кажа, што корпус дызайну, дзе яна вучылася, знаходзіўся ў аддаленасці ад асноўнага. У аўдыторыях факультэта было шмат інвентару для практычных заняткаў: лічбавыя дошкі, камп'ютарныя класы, камеры, светлавое абсталяванне. Праз спецыфіку навучання кабінеты мелі шмат прасторы і святла. Да таго ж, студэнты мелі доступ да мноства майстэрняў, аснашчаных вузкаспецыяльнымі інструментамі.

Адно з любімых месцаў студэнтаў-дызайнераў – лаўнж-зона з канапкамі, стэндам з прафесійнымі часопісамі, а таксама дошка са стыкерамі, дзе кожны можа пакінуць пасланне сваім сябрам.

– Часта ля канапак вывешвалі работы навучэнцаў – як жартоўныя, так і грунтоўныя, вучэбныя. І да іх таксама можна было прымацоўваць стыкеры з рэакцыямі або смешнымі каментарамі. Такія дробязі рабілі корпус утульным, – падзялілася ўражаннямі студэнтка.

Што датычыцца інтэрнатаў, то ў БФУ дзяўчына жыла недалёка ад галоўнага корпуса. Пакоі там уяўлялі сабой блокі кватэрнага тыпу. Як правіла, двум студэнтам давалася аднапакаёвая «кватэра» з кухняй, вялікім спальным пакоем і санвузлом.

## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ З ВЯДОМЫМІ СТУДЫЯМІ

– Камунікацыя на парах пабудавана такім чынам, што падчас вывучэння нейкай дысцыпліны выкладчыкі дапамагаюць студэнтам рэалізоўваць іх таленты на практыцы. Мне расказалі гісторыю, што незадоўга да майго прыезду ад спецыяльнасці «дызайн прасторавага асяроддзя» сабралі групу актыўных студэнтаў, якія паехалі ў Маскву ўдзельнічаць у конкурсе «Школа мары». Падчас конкурснай праграмы іх таксама пазнаёмілі з творчасцю іншых дызайнераў, прадставілі многім майстрам. Там студэнты на практыцы навучыліся навыкам камунікацыі, публічнага выступу і прэзентацыі свайго праекта, – заўважыла Ганна. – Лічу, адна з мэт такой паездкі – крок да таго, каб у будучыні навучэнцы самастойна маглі ўдзельнічаць у падобных праектах, не баючыся паказваць свае сілы. Такім чынам студэнты вучацца прасоўваць свае ідэі, а выкладчыкі, задзейнічаныя ў індустрыі, перадаюць веды, як паказаць ідэю найбольш прывабна для інвестараў.

Яшчэ адна перавага вучэбнага працэсу, у які заглыбілася дзяўчына, супрацоўніцтва кафедраў з буйнымі анімацыйнымі студыямі Масквы і Санкт-Пецярбурга «Саюзмультфільм», «Млын» і «Паравоз». Студэнты заключаюць з імі кантракты, пачынаючы з другога курса, і паралельна іх дзейнасць у гэтых арганізацыях залічваецца як летняя практыка. Таму вельмі часта моладзь працягвае там працаваць і пасля выпуску.

– Увогуле, я захоплена Калінінградам. Там вельмі незвычайная архітэктура, і мне было дзіўна бачыць нязвыклыя будынкі, завулкі, крамкі. На стажыроўцы я вывучала прадметы, якія не выкладаюць на маёй спецыяльнасці, таму вельмі цікава было не толькі паглыбіць свае веды, але і проста атрымаць столькі станоўчага вопыту. Перапоўнена самымі лепшымі ўражаннямі. Ва ўніверсітэце да мяне ўсе ставіліся вельмі добразычліва, і я была б рада паўтарыць падобны вопыт, – падвяла вынікі дзяўчына.

**Ірына ІВАШКА**

## ДАВЕДКА

Вышэйшая школа камунікацый і крэатыўных індустрый БФУ імя І. Канта – буйны цэнтр падрыхтоўкі філолагаў, журналістаў, PR-менеджараў, спецыялістаў у галіне маркетынгу і рэкламы, дызайнераў, мастакоў анімацыі, графічных рэдактараў і ўрбаністаў.

УНІВЕРСІТЭТ
30 верасня 2024 года, № 9 (2287)

# МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ЎНІВЕРСІТЭТА

## МЭТА №1 ПАВЫШЭННЕ ЯКАСЦІ АДУКАЦЫІ ВА ЎМОВАХ ТРАНСФАРМАЦЫІ ГРАМАДСТВА І ТЭХНАЛОГІЙ

**Задачы ў рамках мэты на 2024/2025 год:**

- Праходжанне дзяржаўнай акрэдытацыі па спецыяльнасці
- Трансфармацыя адукацыйнага працэсу з улікам запатрабаванняў соцыуму ў новых ведах і кампетэнцыях пасродкам персаніфікацыі і лічбавізацыі

## МЭТА №2 ПАВЕЛІЧЭННЕ ДОЛІ ВЫСАКАКЛАСНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ І ПЕРАДАВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Задачы ў рамках мэты на 2024/2025 год:**

- Пашырэнне прысутнасці БДУ ў сусветнай навуковай прасторы і развіццё міжнародных камунікацый
- Фарміраванне цэнтраў прадукавання і ўкаранення тэхналагічных і арганізацыйных інавацый, павелічэнне долі прыкладных даследаванняў і распрацовак, павышэнне даходаў універсітэта ад камерцыялізацыі вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці
- Інтэграцыя навуковай, інавацыйнай і адукацыйнай дзейнасці БДУ

## МЭТА №3 РАЗВІЦЦЁ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНТНАСЦЯЎ ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ І АДМІНІСТРАЦЫЙНА-КІРАЎНІЧАГА ПЕРСАНАЛУ

**Задачы ў рамках мэты на 2024/2025 год:**

- Выкарыстанне механізмаў прыцягнення кваліфікаваных спецыялістаў са знешніх крыніц пры фарміраванні рэзерву кадраў БДУ
- Скарачэнне вакансій ПВС і работнікаў універсітэта пасродкам размеркавання выпускнікоў у БДУ і распрацоўкі механізму арганізацыі мэтавай падрыхтоўкі студэнтаў для ўласных запатрабаванняў БДУ
- Укараненне сістэмы настаўніцтва, выпрацоўка механізмаў па замацаванні маладых спецыялістаў на працоўных месцах
- Укараненне рэйтынгавай сістэмы аплаты працы маладых навукоўцаў з ліку ПВС (ва ўзросце да 35 гадоў), асобнай ад рэйтынгавай сістэмы аплаты працы ПВС БДУ
- Аўтаматызацыя інфармацыйных сістэм у галіне кадравага адміністравання з улікам бягучых змен у заканадаўстве

# Цікавыя лічбы: некаторыя вынікі

**Паказчык цякучасці кадраў**




**Паказчык цякучасці кадраў сярод маладых спецыялістаў**




**Эфектыўнасць рэзерву кадраў**



# НА 2024/2025 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

## МЭТА №4

## РАЗВІЦЦЁ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ Ў КАНТЭКСЦЕ ТРАНСФАРМАЦЫІ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА АСЯРОДДЗЯ

### Задачы ў рамках мэты на 2024/2025 год:

- Павышэнне эфектыўнасці ідэалагічнай і выхаваўчай работы з выкарыстаннем новых формаў і метадаў, накіраваных на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне маладых людзей, фарміраванне і развіццё іх духоўна-маральных каштоўнасцяў, прафілактыку асацыяльных паводзін
- Распрацоўка і ўкараненне інавацыйных формаў і метадаў працы, стварэнне ўмоў для самаразвіцця і самарэалізацыі моладзі
- Павышэнне якасці працы органаў студэнцкага самакіравання і грамадскіх арганізацый і ўзмацненне іх ролі ў ІВР

## МЭТА №5

## ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ І РАЗВІЦЦЁ ЭКСПАРТНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ БДУ

### Задачы ў рамках мэты на 2024/2025 год:

- Умацаванне станоўчага іміджу БДУ за мяжой шляхам пашырэння геаграфіі традыцыйных партнёраў і выканання плана экспарту
- Аптымізацыя структуры набору замежных грамадзян
- Дыверсіфікаванне ўдзелу ў міжнародных рэйтынгах і захаванне пазіцый у існуючых

## МЭТА №6

## ПАБУДОВА ЎСТОЙЛІВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ МАДЭЛІ БДУ І ДЫВЕРСІФІКАВАННЕ КРЫНІЦ ДАХОДАЎ

### Задачы ў рамках мэты на 2024/2025 год:

- Пабудова ўстойлівай эканамічнай мадэлі БДУ
- Будаўніцтва новых аб'ектаў БДУ
- Рамонт існуючых аб'ектаў інфраструктуры

# дзейнасці ўніверсітэта за 2023/2024

Экспарт адукацыйных паслуг, тыс. дол. ЗША




Дынаміка даходаў БДУ ў 2023 і рост да 2022 года, млн руб.




Дынаміка сярэдняй заработнай платы ў БДУ



УНІВЕРСІТЭТ
30 верасня 2024 года, № 9 (2287)

# ШАХМАТНАЕ СЕРАБРО З УЛАДЗІВАСТОКА



**Зборная БДУ заваявала сярэбраны медаль па хуткіх шахматах на І Міжнародных моладзевых студэнцкіх летніх гульнях «Маладосць Прымор'я», якія прайшлі ў расійскім Уладзівастоку.**

За перамогу змагаліся пяць каманд. Кожная з іх сыграла па чатыры матчы. Беларуская зборная, якую прадстаўлялі другакурснікі ФПМІ Раман Архіпаў (ФПМІ), Аляксандр Алішэвіч (юрфак), Арцём Сіняўскі (ФРКТ) і студэнты 3 курса Наталля Мельнікава (ФРКТ) і Міхаіл Каспяровіч (хімфак), саступіла толькі ўдзельнікам з Кітая. А кіраўніком каманды быў выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ Анатоль Кудзін.

Спартсмены прызнаюцца, што высокі ўзровень каманд-удзельніц яны адзначылі адразу ж, тым самым маральна падрыхтаваўшыся да сур'ёзнага супрацьстаяння. Першыя паядынкі прайшлі не на карысць беларускай зборнай: з лікам 4,5:0,5 перамогу забрала кітайская каманда. Аднак апускаць рукі студэнты БДУ не збіраліся – чакалі яшчэ тры паядынкі. І ва ўсіх удача была ўжо на баку нашай зборнай: спартсмены абыгралі дзве каманды з Расіі (5:0; 5:0) і адну з Узбекістана (3:2). Дарэчы, па выніках турнірнай табліцы Наталля Мельнікава і Арцём Сіняўскі паказалі на сваіх дошках найлепшы вынік. Як аказалася, не выпадкова – адбўся іх вялікі вопыт: дзяўчына з'яўляецца кандыдатам у майстры спорту, а хлопец – майстрам спорту.





Цікава, што самыя раннія ўспаміны Наталлі Мельнікавай пра шахматы адносяцца да пачатковай школы. Тады малая за кампанію з сябрамі трапіла на факультатыў. Там, паставіўшы на другой гульні першы мат, адчула ў сабе інтарэс да гульні. Дзякуючы трэнеру, які браў школьніцу на розныя спаборніцтвы, звычайны інтарэс паціху трансфармаваўся ў адточаную тэхніку. На І Міжнародных моладзевых студэнцкіх летніх гульнях дзяўчына адыграла партыі з прадстаўніцамі зборных Кітая, Узбекістана і Расіі (за яе выступілі студэнты Далёкаўсходняга федэральнага ўніверсітэта і Уладзівастоцкага дзяржаўнага ўніверсітэта эканомікі і сэрвісу).

Арцёма Сіняўскага ва ўзросце 5 гадоў з шахматамі пазнаёміў дзядуля. Гульні праходзілі на старой дошцы, дзе ў чорнага караля не было вярхушкі. Дзед і ўнук праседжвалі за партыямі цэлыя вечары, і бацькі пачалі падаграваць заўважаны інтарэс сына да гэтага віда спорту.

– Хутка я пайшоў на сваю першую секцыю. Трэнер разгледзеў ува мне здольнасці і парэкамендаваў маме і тату адвесці мяне ў СДЮШАР, дзе б можна было займацца больш сур'ёзна. Так паступова і выйшаў у прафесіянальныя шахматы, – дзеліцца другакурснік. – Не магу сказаць, што жаданне кінуць не было ніколі. Дзякуй маім бацькам, якія засцераглі мяне ад неабдуманых дзеянняў напачатку. Цяпер ужо, калі падганяюць поспехі і канкурэнцыя, такія думкі нават не прыходзяць у галаву.

Сярэбраныя прызёры ў адзін голас узгадваюць сяброўскія адносіны на ўсіх гульнях і высокі ўзровень арганізацыі.

– Уразіў, безумоўна, і сам Уладзівасток. Востраў Рускі, дзе мы гулялі, злучаны з горадам вялікім мостам, на які з пірса бухты Аякс адкрываўся цудоўны выгляд. Асабліва калі яго ахутваў ранішні туман, і адтуль выглядвалі толькі верхавіны пілонаў, – кажуць студэнты. – Немагчыма таксама не адзначыць гасціннасць арганізатараў, прыгажосць цырымоній і прадуманасць вольнага часу спартсменаў. Хацелася б, каб такія спаборніцтвы праходзілі як мага часцей.

**Ірына ІВАШКА**

## ДАВЕДКА

Удзельнікамі І Міжнародных моладзевых студэнцкіх гульняў «Маладосць Прымор'я» сталі каля 500 студэнтаў з Беларусі, Расіі, Кітая, КНДР, Узбекістана і Індыі. Пяцідзённая праграма ўключала індывідуальныя і камандныя спаборніцтвы па бадмінтоне, баскетболе, боксе, пляжным валейболе, лёгкай атлетыцы, тэнісе, настольным тэнісе, плаванні, грэблі-індор, фіджытал-баскетболе, міні-футболе і шахматах.

У склад нацыянальнай зборнай увайшлі студэнты БДУ, БДУІР, БДУФК, БНТУ, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі і ВДТУ.

На гульнях разыгралі 383 медалі. Першае агульнакаманднае месца занялі беларускія спартсмены (на іх рахунку 19 залатых, 8 сярэбраных і 9 бронзавых узнагарод). На другой прыступцы п'едэстала апынулася зборная Далёкаўсходняга федэральнага ўніверсітэта, а на трэцяй – каманда КНДР.

## НАВІНЫ

У Дзень народнага адзінства 124 жыхаркі Беларусі былі ўдастоены ордэна Маці за нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей

У Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры адкрылася выстава «Ракурсы творчасці», прымеркаваная да 85-годдзя з дня нараджэння вядомай опернай спявачкі, народнай артысткі Беларусі Святланы Данілюк

Другакурсніца факультэта міжнародных адносін БДУ Вікторыя Нікалаева ўзяла серабро чэмпіянату свету па шашках

БЕЛАЗ прыняў удзел у міжнароднай выставе найноўшых тэхналогій у галіне здабычы і перапрацоўкі карысных выкапняў MINEXPO AFRICA, якая адбылася ў Аб'яднанай Рэспубліцы Танзанія

# ГЭТА ХТО? ГЭТА «ВІВАТ, СТУДЭНТ БДУ»!



**13 верасня ва ўніверсітэце прайшло найбуйнейшае свята першакурснікаў гэтай восені – «Віват, студэнт БДУ». Падзея, якую адзначаюць ужо 25 гадоў, аб'яднала больш за чатыры тысячы маладых людзей.**

Сёлета ўрачыстай частцы мерапрыемства папярэднічала адмысловая «пераклічка» студэнтаў розных факультэтаў. «Гэта хто? Гэта хто? Жуууурфак!», «Муха села на варэнне… Эээээканамфак», – гэтыя і іншыя крычалкі даносіліся з розных куткоў Палаца спорту, які ўжо каторы год гасцінна сустракае гасцей. Тут на працягу трох гадзін першакурснікі ўдзельнічалі ў конкурсах, рабілі здымкі ў фотазонах, знаёміліся з напрамкамі дзейнасці творчых і спартыўных напрамкаў БДУ.

Святочную цырымонію адкрылі лазернае шоу і парад дэканаў. Па традыцыі завяршаў святочнае шэсце рэктар Андрэй Кароль.

– Універсітэт уяўляе сабой жывы арганізм, які мае непаўторнае гучанне і больш за сто гадоў захоўвае сакрэт пераемнасці пакаленняў. Гэта ўнікальнае месца, дзе можна стварыць сябе, далучыўшыся да яго. Жадаю вам ніколі не адрывацца ад гэтага вялікага дрэва БДУ і заўсёды памятаць, што тут ваша радзіма, – павітаў прысутных Андрэй Дзмітрыевіч.

Чатырохсотбальнік гэтага года першакурснік юрфака Руслан Хомчанка, выступаючы ад імя студэнтаў, адзначыў, што на сцэне «Віваты» хвалюецца больш, чым на экзаменах. Хлопец выказаў думку, што, нягледзячы на адрозненні першакурснікаў, іх усіх аб'ядноўвае прыналежнасць да ўніверсітэта. Таму статус навучэнца БДУ абавязвае моладзь быць для навакольных узорам ва ўчынках і дзеяннях.

Затым, пасля ўручэння сімвалічнага студэнцкага білета, разам з Русланам першакурснікі прачыталі клятву студэнта ўніверсітэта. І вядучыя Юлія Качура, Марыя Грыцкевіч, Сяргей Ладысеў і Крысціна Гарун далі старт нефармальнай частцы вечара. Тут для студэнтаў музычныя і харэаграфічныя віншаванні падрыхтавалі вакалісты БДУ, заслужаныя і аматарскія ансамблі Беларусі «Крыжачок», «Неруш» і «Сарматы».

Перлінай другой часткі свята стаў дуэт вядучых з ваеннага факультэта Аляксея Арэф'ева і Андрэя Манько. За непрацяглы час хлопцы паспелі спець хорам з першакурснікамі, пажартаваць і раскачаць залу. А іх абвяшчэнні выхаду артыстаў неадройчы выклікалі ўсмешкі прысутных.

– Я добры, прыгожы, цікавы малады чалавек, – звяртаецца да дзяўчат Андрэй.

– Гэта ты кажаш першаму курсу. А другі, трэці, чацвёрты, магістратура і аспірантура ведаюць, што ты далёка не такі, – падхоплівае Лёша. І першакурснікі ўжо разумеюць, што хутка на сцэне з'явіцца вакаліст з песняй «Ты не такі». Так, для новых студэнтаў БДУ пад прэзентацыю хлопцаў прагучалі кампазіцыі «Былі танцы», «Flowers», «Мой мармеладны», «Начныя ліхтары» і інш.

А спецыяльным госцем праграмы, якая завяршыла свята, стала выступленне музычнага гурта COZA NOSTRA. Апошнія кампазіцыі вечара прагучалі пад суправаджэнне соцень ліхтарыкаў у руках першакурснікаў.

**Ірына ІВАШКА**

## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

### НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ

**Эканамічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры фінансавага кантролю, аналізу і аўдыту | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры міжнароднай палітычнай эканоміі | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 29 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. К. Маркса, д. 31, каб. 65; да 28 лістапада.

**Кафедра педагогікі і праблем развіцця адукацыі аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 234; да 29 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 234; да 28 лістапада.

**Інстытут бізнесу БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры бізнес–адміністравання | 5 гадоў |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 203; да 29 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 213; да 28 лістапада.

**Фізічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры біяфізікі | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315; да 29 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г, Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326; да 28 лістапада.

УНІВЕРСІТЭТ
30 верасня 2024 года, № 9 (2287)

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| *Загадчык* | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | [2] На пасаду загадчыка кафедры прызначаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, вучоную ступень доктара або кандыдата навук, навуковыя працы, стаж работы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| *Прафесар* | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | [3] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| *Дацэнт* | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| | [4] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| *Выкладчык* | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 год; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| *Старшы выкладчык* | На пасаду старшага выкладчыка прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю і стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 3 гады |
| | [5] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |

**Кафедра фізічнага выхавання і спорту аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту | |
| Выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 8 А, УСК «Універсітэцкі», каб. 215; да 29 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Кастрычніцкая, 8 А, УСК «Універсітэцкі», каб. 224; да 28 лістапада.

**Факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры інтэлектуальных сістэм | 1 год |
| Дацэнт кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій | бестэрмінова |
| Старшы выкладчык кафедры інфарматыкі і камп’ютарных сістэм | бестэрмінова |
| Асістэнт кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій | бестэрмінова |
| Асістэнт кафедры інтэлектуальных сістэм | бестэрмінова |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Курчатава, 5, пакой 601; да 29 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Курчатава, 5, пакой 605; да 28 лістапада.

**Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры геаграфічнай экалогіі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры геаграфічнай экалогіі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры геадэзіі і касмааэракартаграфіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры рэгіянальнай геалогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры рэгіянальнай геалогіі | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм | 3 гады |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 223; да 29 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 16, каб. 213; да 28 лістапада.

**Факультэт журналістыкі аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры міжнароднай журналістыкі | 3 гады |
| Загадчык кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання | 3 гады |
| Загадчык кафедры медыялогіі | 1 год |
| Прафесар кафедры медыялогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры медыялогіі | 2 гады |
| Дацэнт кафедры медыялогіі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання | 2 гады |
| Дацэнт кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання | 3 гады |
| Дацэнт кафедры міжнароднай журналістыкі | 2 гады |
| Дацэнт кафедры міжнароднай журналістыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры міжнароднай журналістыкі | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры міжнароднай журналістыкі | бестэрмінова |
| Дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі | 2 гады |
| Дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі | 5 гадоў |
| Выкладчык кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі | бестэрмінова |
| Прафесар кафедры тэлебачання і радыёвяшчання | 3 гады |
| Старшы выкладчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання | бестэрмінова |
| Старшы выкладчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання | бестэрмінова |
| Дацэнт кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры тэхналогій камунікацыі і сувязяў з грамадскасцю | 3 гады |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 301; да 29 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 323; да 28 лістапада.

**Юрыдычны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права | 2 гады |
| Дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права | 1 год |
| Дацэнт кафедры грамадзянскага права | 3 гады |
| Дацэнт кафедры грамадзянскага права | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры грамадзянскага права | 3 гады |
| Дацэнт кафедры гаспадарчага права | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права | 2 гады |
| Дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права | 1 год |
| Дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры гаспадарчага права | |
| Старшы выкладчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права | |
| Выкладчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: вул. Ленінградская, 8, кабінет 218; да 29 кастрычніка.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: вул. Ленінградская, 8, кабінет 104; да 28 лістапада.







## НДІ ЯП БДУ

### АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ

Старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі тэарэтычнай фізікі (1 чалавек).

Тэрмін правядзення конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб’явы. Адрас: 220006, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, каб. 315, тэл. 352-42-31.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 30.09.2024 г.
Зак. 879. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*